## Нашы спачуванні



Днямі пайшоў з жыцця доктар філасофскіх навук, прафесар кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ **Энгельс ДАРАШЭВІЧ**. Для яго сяброў, калегаў і вучняў Энгельс Канстанцінавіч – прыклад самаадданасці адвечным каштоўнасцям навукі, духоўнасці і справядлівасці.

Э. Дарашэвіч нарадзіўся 26 кастрычніка 1931 г. у Мінску ў сям'і служачых. У вайну сям'я была ў эвакуацыі, бацька (Канстанцін Дарашэвіч) загінуў, змагаючыся з акупантамі ў мінскім падполлі. Па сканчэнні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з 1953 г. выкладаў у Горы-Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. З 1958 г. працаваў у Інстытуце філасофіі і права Акадэміі навук БССР. У 1985 г. абараніў доктарскую дысертацыю «Філасофія эпохі Асветы ў Беларусі». У 1984 г. стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР за ўдзел у напісанні цыкла даследаванняў па гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 1990 г. было прысвоенае вучонае званне прафесара.

У 1990 – 2000-я гг. прафесар Э. Дарашэвіч працаваў у НАН Беларусі загадчыкам аддзела Рэспубліканскага цэнтра сацыялагічных даследаванняў пры Інстытуце філасофіі і права, галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута сацыялогіі АН БССР і ў сталічных установах вышэйшай адукацыі. З 2009 г. – прафесар кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ, працягваў падтрымліваць плённыя навуковыя сувязі з акадэмічнай навукай, калектывам Інстытута філасофіі НАН Беларусі, удзельнічаў у палявой экспедыцыйнай дзейнасці кафедры.

**ГА «Беларускі фонд культуры» і «Краязнаўчая газета» смуткуюць з прычыны смерці прафесара Энгельса ДАРАШЭВІЧА, даўняга сябра БФК, удзельніка журы фальклорнага фестывалю «Берагіня» ды іншых мерапрыемстваў фонду. Выказваем шчырыя спачуванні родным, блізкім і калегам навукоўцы. Светлая памяць аб ім і зробленае гэтым чалавекам застануцца ў нашай памяці.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ